стан выхаванцаў, педагагічнага, культуралагічнага персаналу, аналізаваць узровень развіцця культурна-выхаваўчага асяроддзя, асобных яго кампанентаў, ацэньваць метадычнае забеспячэнне працы педагагічнага калектыву, абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт.

На распрацоўку гэтага ўмення павінна быць накіравана педагагічная практыка студэнтаў. Яна не толькі замацоўвае веды, але і дае магчымасць выявіць творчы падыход да вырашэння практычных задач. А гэта з'яўляецца завяршальным этапам сістэмнага засваення дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла.

Разгледжаныя аспекты падрыхтоўкі спецыялістаў даюць падставы сцвярджаць: у адукацыйныя стандарты неабходна закласці трывалую аснову ўспрымання ведаў і навыкаў. Яна дазволіць творча падысці да вырашэння надзённых сацыякультурных праблем.

**Р.А.Ровіна, В.А.Касап,** *дацэнты*

## МЕСЦА І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКЛАДАННЯ ГАЛІНОВЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ КУРСАЎ ВА ЎМОВАХ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Бібліяграфічная падрыхтоўка студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў з'яўляецца састаўной часткай агульнапрафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. У спецыяльным друку перыядычна праходзяць дыскусіі наконт удасканалення бібліяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Так, вядомыя дыскусіі адбываліся ў канцы 70-х гадоў у сувязі з выхадам манаграфіі А.П.Коршунава, у другой палове 80-х гадоў вакол перабудовы вышэйшай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, у пачатку і ў другой палове 90-х гадоў яны былі звязаны з распрацоўкай у Расіі, іншых краінах СНД адукацыйных стандартаў. У іх бралі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзел вядомыя тэарэтыкі бібліяграфічнай дзейнасці А.П.Коршунаў, Н.А.Сляднева, Г.К.Быстрова, В.А.Факееў, І.Маргенштэрн, В.Е.Лявончыкаў, Р.А.Ровіна, М.Я.Яцэвіч і інш.

У розныя перыяды падрыхтоўка бібліятэкараў ажыццяўлялася па тыпах бібліятэк, галіновых комплексах літаратуры, функцыянальнай прымеце, характары інфармацыйных патрэбнасцей, адначасова некалькіх прыметах.

У наш час, калі закладваюцца асновы падрыхтоўкі бібліятэкараў XXI ст., узнікаюць новыя сацыякультурныя рэаліі, адбываецца рэформа сістэмы адукацыі, укараняюцца адукацыйныя стандарты, павінны быць вызначаны прыярытэты ў бібліяграфічнай падрыхтоўцы, асэнсаваны навуковыя дасягненні, прадстаўлены перспектыўныя накірункі, вызначана месца галіновых бібліяграфічных дысцыплін у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў.

У апошнія гады значна змянілася матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэк, карэнным чынам перамянілася грамадства. Змены адбыліся ў густах, інтарэсах, светапоглядзе людзей. У бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці на сучасным этапе адчуваецца ўзмацненне ролі аўтаматызацыі працэсаў, назіраецца змяненне функцый бібліятэк па забеспячэнні доступу спецыялістам да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.

Галіновыя бібліяграфічныя курсы прайшлі доўгі шлях развіцця, удасканалення. У наш час навучанне вядзецца па гістарычна абумоўленых, апрабіраваных практыкай наступных галіновых бібліяграфічных комплексах: светапоглядным, эканамічным, эстэтычным, прыродазнаўча-тэхнічным, біялагічна-медыцынскім.

Праграмы падрыхтоўкі бібліятэкараў па галіновых бібліяграфічных дысцыплінах былі складзены на аснове адзіных падыходаў. Звярталася ўвага на:

1) асаблівасці галіны, уплыў на бібліяграфічную дзейнасць;

2) асаблівасці аб'екта галіновай бібліяграфіі — дакументальныя патокі, інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў;

3) арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці ў галіне;

4) спецыфіку інфармацыйных рэсурсаў галіновага комплексу;

5) бібліяграфаванне галіновых дакументальных комплексаў;

6) выкарыстанне галіновых бібліяграфічных рэсурсаў у абслугоўванні карыстальнікаў.

Раней гэта забяспечвала сістэму бібліяграфічнай падрыхтоўкі, спрыяла ліквідацыі непаслядоўнасці, разгляду другарадных праблем галіновых бібліяграфічных комплексаў. Цяпер існаванне галіновых бібліяграфічных курсаў у вучэбных планах абумоўлена універсалізмам падрыхтоўкі бібліёграфаў, хісткасцю меж спецыялізацый, адсутнасцю размеркавання спецыялістаў згодна з абранай спецыялізацыяй.

З аднаго боку, звузілася нацыянальная інфармацыйная прастора Беларусі, адбыліся негатыўныя зрухі сістэмы інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай, сацыягуманітарнай сфер. З другога — пачалося шырокае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій на практыцы, сталі адмаўляцца ад традыцыйных бібліяграфічных паказальнікаў, з'явіліся праграмы і напрамкі падрыхтоўкі бібліятэкараў па галіновых бібліяграфічных курсах, якія патрабуюць карэкціроўкі, адмаўлення ад уніфікацыі.

Галіновая бібліяграфічная падрыхтоўка заўсёды базіравалася на зместавых і відавых асаблівасцях дакументальных патокаў, на спецыфіцы інфармацыйных патрэбнасцей. Яна адпавядала сферам чалавечай дзейнасці — прафесійнай і непрафесійнай. Пераважна ў межах галіновых бібліяграфічных комплексаў якраз можна навучыць інфармацыйнаму забеспячэнню прафесійнай дзейнасці спецыялістаў, непрафесійных інфармацыйных патрэбнасцей чытачоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адзначаюць практыкі, выкладчыкі бібліятэчных факультэтаў ВНУ, падчас выканання прафесійных абавязкаў бібліятэкары адчуваюць цяжкасці на ўзроўні зместавых бар'ераў: разумення і зносін. Часцей гэта выяўляецца пры адборы дакументаў з мэтай камплектавання фондаў, падрыхтоўцы бібліяграфічных паказальнікаў, баз даных (БД), ажыццяўленні кансультацый па выкарыстанні даведачна-бібліяграфічнага апарату, індэксаванні дакументаў, іх аналітыка-сінтэтычнай апрацоўцы, а таксама інфармаванні спажыўцоў.

Для ліквідацыі пералічаных бар'ераў бібліяграфавання, бібліяграфічнага абслугоўвання бібліятэкар павінен мець галіновыя веды. Яны мусяць адрозніваццa ад ведаў спецыялістаў галіны, быць агляднымі, прыкладнымі. Набываць іх належыць паслядоўна пры вывучэнні гуманітарных, сацыяэканамічных і агульнапрафесійных дысцыплін. Неабходная пераемнасць у тэрмасістэме гэтых дысцыплін і галіновых бібліяграфічных курсаў.

У сучасны перыяд падобныя сувязі выяўляюцца слаба. Гэта адмоўна ўплывае на засваенне ведаў у ходзе вывучэння галіновых бібліяграфічных курсаў. З мэтай ліквідацыі такога становішча трэба ўключаць у вучэбныя праграмы, іншую вучэбна-метадычную дакументацыю пералік ключавых слоў (тэзаўрус) базавых тэрмінаў, якія патрабуюць засваення.

Удакладненне месца і зместу галіновых бібліяграфічных дысцыплін у вучэбных планах патрэбнае і ў сувязі з дубліраваннем у выкладанні агульнапрафесійных, спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацый (пераважна звязаных з тэхналагічным працэсам бібліяграфавання і абслугоўвання карыстальнікаў).

Напрыклад, праблемы падрыхтоўкі інфармацыйных прадуктаў – бібліяграфічных паказальнікаў, БД, аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў, інфармацыйнага пошуку, выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў у абслугоўванні – разглядаюцца паралельна або паступова ў розных курсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах ліквідацыі дубліравання і ў бібліяграфічных курсах, і ў цыкле спецыяльных дысцыплін неабходна выкарыстоўваць метадалагічныя падыходы да ўдасканалення адукацыйнага стандарта. Імі могуць быць:

— мяккія патрабаванні да пераліку спецыяльных дысцыплін;

— улік патрабаванняў да падрыхтоўкі бібліятэкараў з боку асноўнага заказчыка — бібліятэк рэспублікі;

— варыятыўнасць падыходаў да набору спецыяльных дысцыплін;

— улік поліфункцыянальнай дзейнасці бібліятэк;

— улік асаблівасцей развіцця грамадства і тыпаў дзейнасці, на якія скіравана бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць.

Зыходзячы з гэтага, да галіновых бібліяграфічных дысцыплін можна падыходзіць з філасофскіх пазіцый агульнага (А) і канкрэтнага (К).

Агульнапрафесійныя курсы

**А:** Агульная тэорыя бібліяграфіі → Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці → Галіновае бібліяграфазнаўства

Спецыяльныя дысцыпліны

**К:**

Інфармацыйнае забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці (прафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнай дзейнасці (прафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне экалагічнай дзейнасці (прафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне юрыдычнай дзейнасці (прафесійныя ІП)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйнае забеспячэнне дзейнасці ў галіне аховы здароўя (прафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне дзейнасці ў галіне культуры і мастацтва (прафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне краязнаўчай дзейнасці (прафесійныя і непрафесійныя ІП)

Інфармацыйнае забеспячэнне непрафесійнай дзейнасці ў галіне самаадукацыі, пашырэння кругагляду (непрафесійныя ІП)

Пералік курсаў не павінен быць пастаянным. Ён мусіць абапірацца на патрэбнасці бібліяграфічнай практыкі рэспублікі, дзейнасць прыярытэтных праграм развіцця грамадства.

Для ўзмацнення тэхналагічнай падрыхтоўкі студэнтаў з мэтамі навучання бібліяграфічнай рабоце ў аўтаматызаваным рэжыме, ліквідацыі дубліравання выкладаемых курсаў можна выкарыстаць іншы падыход. Ён дазволіць у структуры галіновых бібліяграфій вылучыць тэарэтычную частку: "Інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне галіновых комплексаў" (навукова-тэхнічнага, сацыяльна-гуманітарнага), а таксама частку практычна накіраваную, якую мэтазгодна будзе перанесці ў дысцыпліны спецыялізацый — у "Практыкум па бібліяграфаванні навукова-тэхнічнай літаратуры", "Практыкум па бібліяграфаванні старажытнай і рэдкай кнігі", "Практыкум па бібліяграфаванні літаратуры па мастацтве", "Практыкум па бібліяграфаванні дзіцячай літаратуры" і інш.

Як адзін са шляхоў ліквідацыі міжкафедральнага дубліравання выкладаемых дысцыплін можна прапанаваць аб'яднаныя курсы: "Бібліятэчна-інфармацыйнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці" і інш. У іх праблемы бібліяграфічнага забеспячэння знайшлі б адпаведнае месца разам з каталагізацыяй дакументаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраваннем фондаў дакументаў, асаблівасцямі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання. Прыкладам курсаў такога тыпу з'яўляецца курс "Патэнтна-інфармацыйная дзейнасць". Ён чытаецца для дзвюх спецыялізацый: "навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі", "менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы". У перспектыве бачым стварэнне яшчэ некалькіх падобных курсаў — "Бібліятэчна-інфармацыйнае забеспячэнне стандартызацыі" і інш. Але чытанне падобных аб'яднаных курсаў патрабуе новых падыходаў у пабудове структуры факультэта, вылучэнні кафедраў з назвамі "Інфармацыйнае забеспячэнне гуманітарнай дзейнасці", "Інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнай дзейнасці".

Адукацыйныя стандарты нельга лічыць дакументамі, што не падлягаюць зменам. Тым не менш найбольш дынамічнай часткай адукацыйнага стандарта з'яўляюцца блокі спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацый, прызначаных для таго, каб хутка рэагаваць на змены патрэбнасцей заказчыкаў — бібліятэк краіны — у падрыхтоўцы спецыялістаў пэўных прафесійных якасцей. Як сведчыць вопыт падрыхтоўкі адукацыйных стандартаў краін СНД, вышэйшым навучальным установам даецца магчымасць іх варыятыўнага напаўнення пры абавязковым вызначэнні стандартам патрабаванняў да ведаў і навыкаў, што павінен атрымаць студэнт на працягу навучання. У сувязі з гэтым неабходна вызначыць стандартам толькі колькасную характарыстыку ўказаных дысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ